***“Матчынай мовы, багатай і слаўнай, што ў скарбах народа бы фонд залаты...”***

Гаўрош Н.В., Нямковіч Н.М. Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск: Вышэйшая школа, 2012.

Кожны народ за сваю шматвекавую гісторыю назапашвае вялікі жыццёвы вопыт, які ўвасабляе ў кароткія па форме, але глыбокія і багатыя па змесце выслоўі – прыказкі, прымаўкі, параўнанні. Збіральнікі гэтага народнага багацця становяцца гонарам нацыі, на іх арыентуюцца новыя пакаленні вучоных. Для Беларусі такім людзьмі былі і застаюцца І.І.Насовіч, А.К.Сержпутоўскі, М.Я.Нікіфароўскі, М.А.Федароўскі, Ф.М.Янкоўскі, А.С.Аксамітаў і інш.

Наш час уносіць свае карэктывы ў спрадвечны нацыянальны вопыт. Спалучэнне нацыянальнага і індывідуальнага светабачання нараджае новыя формулы чалавечага існавання, якія набываюць адметную паэтычную форму. Так з’яўляюцца афарызмы, крылатыя выслоўі, што нясуць багаты маральны, культурны, нацыянальны і выхаваўчы патэнцыял. Але знайсці, убачыць, “вылушчыць” такія выслоўі з мастацкага тэксту – нялёгкая праца, якая патрабуе вялікай эрудыцыі, увагі да слова, выразнага філалагічнага чуцця. Збіральнікаў такіх выслоўяў значна менш, а выданняў, дзе прадстаўлена гэтая спадчына, як правіла, не вельмі многа. Сярод беларускіх здабыткаў можна ўзгадаць працу Ф.М.Янкоўскага “Крылатыя словы і афарызмы”, з моманту выхаду якой прайшло пяцьдзясят два гады.

І вось зараз скарбонка мудрасці беларускага народа папоўнілася яшчэ адным выданнем. У 2012 годзе у выдавецтве “Вышэйшая школа” выйшла кніга “Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў”, складальнікамі якой з’яўляюцца кандыдаты філалагічных навук прафесар Ніна Васільеўна Гаўрош і дацэнт Ніна Мікалаеўна Нямковіч.

Гэта кніга – вынік шматгадовай напружанай працы па назапашванні, апрацоўцы афарыстычных выслоўяў, іх прэзентацыі вучонаму супольніцтву Беларусі і шырокаму колу чытачоў. Выхаду кнігі папярэднічалі выступленні на навуковых канферэнцыях, знаёмства чытачоў часопіса “Роднае слова” з асобнымі тэматычнымі групамі афарызмаў.

Сабраны матэрыял здзіўляе сваім багаццем: у асноўнай частцы кнігі прадстаўлена каля 3600 крылатых слоў і афарызмаў, выбраных з твораў 182 беларускіх майстроў слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Добра прадуманая і лагічна арганізаваная структура кнігі. Складальнікі падаюць сабраныя выслоўі і па тэматычным прынцыпе (аб'яднаўшы іх у 45 тэматычных груп), і ў алфавітным парадку.

Канцэптуальна важным з'яўляецца першы раздзел – артыкул “Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму”, у якім аўтары сістэмна прадставілі тэарэтычны матэрыял па афарыстыцы: акрэслілі значэнне тэрмінаў “афарызм” і “афарыстычнае выслоўе”, раскрылі сутнасць афарызма як двухпланавай моўнай адзінкі, выявілі падставы для класіфікацыі крылатых выслоўяў, прааналізавалі структуру і кампазіцыю афарызмаў, прадставілі розныя падыходы даследчыкаў да акрэслівання паняцця “афарыстычны тэкст”, апісалі асноўныя спосабы афарызацыі, на яскравых прыкладах паказалі, якім чынам афарызм перадае інфармацыю пра месца свайго нараджэння, нацыянальную прыналежнасць аўтара, менталітэт беларусаў, адносіны да жыцця, працы, роднай мовы, Бацькаўшчыны, маці.

Асноўны раздзел кнігі складаюць афарыстычныя выслоўі, выбраныя з мастацкіх і публіцыстычных твораў беларускіх пісьменнікаў. Загалоўкам да кожнай з 45 тэматычных груп стаў афарызм, які найбольш поўна, на думку складальнікаў, адлюстроўвае змест тэмы, у падзагалоўку пералічаны ключавыя словы: *“Між людзей быць не можа старонняга болю”: Людзі, народ, нацыя; чалавек і грамадства, чалавек і сусвет; дзяржава і закон; улада; палітыка”.* У межах тэматычнай групы афарызмы і крылатыя словы падаюцца ў алфавітным парадку. Шматзначнасць выслоўяў абумовіла падачу асобных з іх у розных тэматычных групах. Напрыклад, выслоўе М.Рудкоўскага *“Суддзя галоўны мой – маё сумленне, /А ісціна – адзіны ў свеце бог”* прадстаўлена ў дзвюх тэматычных групах – *“Ад ісціны – да ісціны: хады – на век жыцця”: Ісціна, праўда, праўдзівасць”* і *“Без чалавечнасці не будзе вечнасці”: Дабрата, чалавечнасць, чуласць, сумленнасць, шчырасць”.* Складальнікі захавалі аўтарскае напісанне афарызмаў і крылатых слоў, пасля кожнага выслоўя пазначаны не толькі аўтар, але і твор-крыніца.

Алфавітны паказальнік афарыстычных выслоўяў складае асобны раздзел кнігі. У ім пасля кожнага выслоўя падаецца старонка ці старонкі, на якіх афарызм прадстаўлены ў асноўнай частцы кнігі.

“Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў” – гэта своеасаблівая цікавая і багатая энцыклапедыя беларускага духу, беларускага характару, увасобленага ў кароткіх і змястоўных фразах, якія належаць лепшым прадстаўнікам беларускай творчай інтэлігенцыі. Знаёмства з ёй адкрывае чытачу арыгінальны погляд на жыццё, месца ў ім чалавека, вучыць любіць і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шанаваць сваю радзіму, мову, прымушае задумацца пра спрадвечныя каштоўнасці чалавечага жыцця.

Акрамя таго, на наш погляд, кніга знойдзе і шырокае практычнае выкарыстанне. Зборнік афарыстычных выслоўяў зможа стаць выдатным дарадцам для настаўніка-філолага. Тут можна знайсці прыгожы і, галоўнае, змястоўны ілюстрацыйны матэрыял для вывучэння розных лінгвістычных тэм, эпіграфы і тэмы сачыненняў, матэрыял для арганізацыя абмеркаванняў і дыскусій па самых розных выхаваўчых праблемах. І зразумела, што сабраныя афарызмы будуць цікавым матэрыялам для далейшага навуковага даследавання.

Некалі, у часы нашага студэнцтва, Ніна Васільеўна Гаўрош і Ніна Мікалаеўна Нямковіч знаёмілі нас з асноўнымі лінгвістычнмі паняццямі, вучылі бачыць заканамернасці ў моўных з’явах, шукаць прычынна-выніковыя сувязі ў моўнай іерархіі. І сёння сваёй кнігай яны працягваюць нас вучыць–бачыць слова, цаніць аўтарскую думку,  быць уважлівым да формы выражэння гэтай думкі.

Азарка В.У., Васілеўская А.С., кандыдаты філалагічных навук, дацэнты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ